The results demonstrate successful application of the innovative approach of technical satellite image processing for the studies of the environment. The presented methods can be used by students of geography.

LITERATURE

1. Du, P., Li, X., Cao, W., Luo, Y., & Zhang, H. (2010). Monitoring urban land cover and vegetation change by multi-temporal remote sensing information // Mining Science and Technology, 20, 0922–0932.
2. Julien, Y., Sobrino, J.A., Jimenez-Munoz, J.-C. (2011). Land use classification from multitemporal Landsat imagery using the Yearly Land Cover Dynamics (YLCD) method // International Journal of Applied Earth Observation and Geoinformation, 13, 711–720.
3. Virtanen, T., Mikkola, K., Patova, E., Nikula, A. (2002). Satellite image analysis of human caused changes in the tundra vegetation around the city of Vorkuta, north-European Russia // Environmental Pollution, 120, 647–658.

УДК 378.14.015.62

## БЯСПЛАТНАЯ ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ ЖАНЧЫН ЗНАХОДЗЯЧЫХСЯ Ў АДПАЧЫНКУ ПА ДОГЛЯДУ ЗА ДЗЯЦЬМІ ЯК КРЫТЭРЫЙ АДПАВЕДНАСЬЦІ ЎЗАЕМААДНОСІН ДЗЯРЖАВЫ ГРАМАДСТВА І СЯМ'І

**Літвінцава Я.В.**
УА ФПБ «Міжнародны універсітэт “МІПСА”
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

У сучасным грамадстве не дастаткова аднаго жадання, каб атрымаць у пэўнай сферы дзейнасці вышэйшую адукацыю. Праблематычнасць бачыцца не толькі ва ўзроўні прафесійнай падрыхтаванасці грамадзян краіны, але і ў платнасці адукацыйнага працэсу, што на сённяшні дзень з'яўляецца перашкодай да самаўдасканальвання як асобы, так і агульнага развіцця грамадства на інтэллектуальнай аснове якога грунтуецца і агульны дабрабыт. Зыходзячы з раздзелу ІІ, артыкула 49 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь беларускім грамадзянам гарантуецца даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі [3]. У сваю чаргу, вышэйшая адукацыя прадугледжана для ўсіх у адпаведнасці са здольнасцямі кожнага. Але атрыманне бясплатнай адукацыі ў дзяржаўных навучальных установах дапушчальна выключна на конкурснай аснове. Паводле Кодэкса Рэспублікі Беларусь “Аб адукацыі” ад 13 студзеня 2011 №243-З [2] вышэйшая адукацыя характарызуецца фарміраваннем ведаў, уменняў, навыкаў і інтэлектуальнага, маральнага, творчага і фізічнага развіцця асобы. Што адлюстроўвае з боку гледжання дзяржавы характар адукацыіі як сыстэмнна прадугледжаный працэсс. А таму дастаткова лагічным і мэтазгодным на думку аўтара выглядае прапанова па наданню увагі у адносінах адукацыі жанчын, знаходзячыхся ў адпачынку па догляду за дзецьмі да трох гадоў. Такі спецыфічны падыход у дачыненні да дадзенай катэгорыі грамадзян абумоўлены неабходнасцю бесперапыннага падтрымання прафесіяналізму жанчын на належным узроўні. Што мае самае непасрэднае дачыненне да захавання іх статусу у сям'і і

сацыяльнай раўнавагі ў адносінах паміж сам'ёй і дзяржавай. Напрыклад, у Расіі Пастановай Урада Расійскай Федэрацыі ад 31 жніўня 2013 года № 756 “Аб правядзенні ў 2013-2015 гадах эксперыменту па навучанні маладых жанчын ва ўзросце да 23 гадоў, якія маюць аднаго і больш дзяцей” [1] устанаўліваецца права маладых жанчын на атрыманне бясплатнай адукацыі на падрыхтоўчых аддзяленнях вышэйшых навучальных устаноў. Маладыя маці падрыхтоўваюцца арыентуючыся на дасягненне станоўчых вынікаў пры здачы дзяржаўных экзаменаў. З рацыянальнага пункту гледжання, аўтарам адзначаецца, што мэтазгодней у дадатак да падрыхтоўкі прадугледзіць і бясплатную вышэйшую адукацыю для такіх маці любога ўзросту, а не толькі для маладых, як гэта прадугледжана расійскім заканадаўствам. Адначасова трэба было б адзначыць, што наяўнасць у жанчын адной вышэйшай адукацыі, не павінна перашкаджаць атрыманню ей іншай вышэйшай адукацыі на бясплатнай аснове. У мэтах забеспячэння якаснай адукацыі для жанчын-маці, аўтарам быў распрацаваны адпаведны праект:

1. Фарміраванне асобнай групы, у якой будуць навучацца выключна жанчыны-маці.

2. Вячэрняя форма навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Перавагі такой формы звязаны з магчымасцю пакінуць дзіця з мужам, які ўвячэрак будзе знаходзіцца дома, а таксама магчымасць жанчыны падрыхтавацца на працягу дня да вывучэння вучэбных дысцыплін.

3. Распрацоўка індывідуальнага адукацыйнага падыходу да кожнага, хто навучаецца. Любы выкладчык абавязаны рыхтавацца да заняткаў ў альтэрнатыўнай форме, улічваючы інтарэсы кожнага.

4. Праграмны характар спецыялізаванага навучання павінен ўключаць у сябе наступныя арыенціры:

А) Штомесячная атэстацыя студэнтаў. З пункту гледжання аўтара, крытэрыі атэстацыі павінны быць наступнымі: наведванне і актыўная праца на семінарскіх і лекцыйных заняткаў; падрыхтоўка да вучэбных дысцыплін; прамова на аснове абранай тэматыкі не менш за два разы; выкананне дадатковых крытэрыяў, пэўныя выкладчыкам у рамках адпаведнай дысцыпліны.

Б) Штоквартальнае тэарэтычнае апытанне на веданне вывучанага і засвоенага матэрыялу. Дадзеная форма інтэлектуальнай працы можа праходзіць толькі вусна, напрыклад як калоквіўм або нешта яшчэ накштал гэтага.

В) Перыядычныя пісьмовыя працы па абранаму навуковаму кірунку ў працэсе навучання. Студэнты, абраўшы навуковую тэму свайго даследавання, прадстаўляюць на студэнцкіх канферэнцыях вынікі сваёй дзейнасці, якія публікуюцца ў навуковых часопісах.

Г) Штогадовая справаздача аб праведзенай навуковай працы. На працягу года студэнты абавязаны будуць падрыхтаваць і здаць справаздачу аб запланаванай і фактычна выкананай працы.

Д) Допуск да экзаменаў. Да здачы экзаменаў дапускаюцца тыя асобы, якія на працягу навучальнага года былі заўсёды атэставаны; маюць станоўчыя адзнакі па праведзімым вусным апытанням; пры наяўнасці не менш чым трох



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

навуковых артыкулаў у зборніках канферэнцый ці часопісах; своечасовае прадастаўленне справаздачы з станоўчай ацэнкай з боку курыруючага данный працэсс выкладчыка. Пасспяховая здача ў канцы навучальнага года ўсіх экзаменаў з'яўляецца падставай для пераводу студэнтаў на наступны курс. У выпадку, калі навучэнец не здае экзамены, ці ж атрымлівае нездавальняючыя вынікі, ён вымушаны будзе застацца на перанавучанне тэрмінам у год.

5. Фармаванне ў вышэйшых навучальных установах бясплатных развіваючых цэнтраў для дзяцей да пяці гадоў. Мэтазгоднасць стварэння такіх цэнтраў аргументуецца неабходнасцю падтрымання маці-студэнтак, у тым ліку адзінокіх маці, якія не маюць магчымасці пакінуць свайго дзіцяці на перыяд наведвання заняткаў.

Жанчына, якая на працягу трох гадоў знаходзіцца ў адпачынку па догляду за дзіцяцем, і не ўдасканальваецца ў інтэлектуальным плане, можа не толькі страціць свой раней дасягнуты ўзровень прафесіяналізму, але і у цэлым стаць некваліфікаваным працауніком. Для узнаўлення страчаннога узроўню і каб зноў стаць прафесіяналам сваёй справы неабходны стаж працы тэрмінам не меьш чым у тры гады, што негатыўна адбіваецца як на самауспрыманіі жанчын-працаунікоў, іх сямейнага асяроддзя так і працы ўстаноў у якіх яны пачынаюць працаваць. Што адлюстроўвае як значнасць формы існуючай праблемы так і неабходнасьці яе вырашэння па сутнасьці.

Неабходна адзначыць, што дзяржава для дасягнення свайго прагрэсіўнага і стабільнага развіцця, абавязана клапаціцца ў адносінах да абароны членаў беларускага грамадства, у адваротным выпадку, гэта вядзе да дэстабілізацыі ўсяго соцыўма. Баланс захавання інтарэсаў грамадства і дзяржавы – гарантыя пераадолення шматаспектных праблем сям'і як асновы пабудовы грамадства.

ЛІТАРАТУРА

1. Вышэйшая адукацыя для маладых мам [Электронны рэсурс] // serpuhov-city.com. - Рэжым доступу: http://serpuhov-city.com/main/465-vysshee-obrazovanie-dlya-molodyh-mam.html. - Дата доступу: 2015/02/11 г.
2. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі [Электронны рэсурс]: 13 студзеня 2011 г., №243-З: прыняты Палатай прадстаўнікоў 2 снежня 2010 г.: ухвалены Саветам Рэсп. 22 сьнежня 2010 года г.: у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 2014/01/04 г. // КонсультантПлюс. Рэспубліка Беларусь / ЗАТ «КонстультантПлюс». - Мінск, 2014
3. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года: з змен. і доп., прынятымі на рэсп. рэферэндуме 24 лістапада 1996 і 17 кастрычніка 2004г. - 10-е выд., Сцёр. - Мінск: Нац. Цэнтр прававой інфарм. Рэспубліка Беларусь, 2014. - 62 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ